УДК УДК (070 + 94) (476) “15/16”

# ЖЫЦЦЁВЫ І НАВУКОВЫ ШЛЯХ АРХЕАЛАГА І ГІСТОРЫКА ВАСІЛЯ РАДЗІВОНАВІЧА ТАРАСЕНКІ. ДА 120-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

*Дзьячкоў Алег Уладзіміравіч*
краязнавец, старшыня гарадской арганізацыі
ТБМ імя Ф. Скарыны г. Магілёва (г. Магілёў, Беларусь).

*У артыкуле прыводзяцца новыя біяграфічныя звесткі пра вядомага беларускага і расійскага археолага, гісторыка, грамадскага дзеяча Васіля Радзівонавіча Тарасенку з архіваў г. Магілёва і Мінска.*

У гэтым годзе 7 лістапада спаўняецца 120 год са дня нараджэння выбітнага беларускага археолага і гісторыка Васіля Радзівонавіча Тарасенкі. Вывучаючы біяграфію гэтага незвычайнага чалавека, здзіўляешся, як многае яму ўдалося і які вялікі ўнёсак зроблены ім у гістарычную навуку. Але калі вы зацікавіцеся жыццём і творчасцю В. Тарасенкі, то непрыемна будзеце здзіўлены тым фактам, як мала ў адкрытых крыніцах ёсць інфармацыі пра яго. Вікіпедыя падае вельмі сціслы нарыс без фотаздымка. Таму, каб нешта новае і цікавае знайсці пра даследчыка, было вырашана звярнуцца да архіваў г. Магілёва і г. Мінска, а таксама удалося сустрэцца з некалькімі гісторыкамі, якія працавалі разам з Васілём Радзівонавічам.


В. Р. Тарасенка

Васіль Радзівонавіч Тарасенка (7.11.1899 – 7.12.1972) – беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук (1947), дацэнт (1932). Скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут (1922), Смаленскі ўніверсітэт (1926). У 1929–1941 гг. – навуковы супрацоўнік Магілёўскага аддзялення Беларускага дзяржаўнага музея і выкладчык Магілёўскага педагагічнага інстытута. З 1944 г. старшы навуковы супрацоўнік, а ў 1960–1966 гг. – загадчык сектара археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР. Выкладчык БДУ і Мінскага педагагічнага інстытута [5, с. 346]. Адзін з заснавальнікаў беларускай гарадской археалогіі.

Вельмі часта з біяграфіі выбітных дзеячаў і даследчыкаў выпадаюць раннія гады жыцця. На наша шчасце, у Цэнтральным навуковым архіве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захавалася асабістая справа, якая ўтрымлівае шмат цікавых звестак пра В.Р. Тарасенку. Вось што ён піша ў сваёй аўтабіяграфіі 15 мая 1952 г.: “Родился я 7 ноября 1899 г. в гор. Петрокове губернском бывш. Привислинского края (ныне Польша) в семье помощника акцизного надзирателя – Родиона Васильевича Тарасенко. Отец мой происходил из крестьян дер. М. Прикол Суджинского у. б. Курской губ., мать, Евгения Андреевна Тарасенко, дочь сельского учителя. Начало I-ой мировой войны заставило нашу семью эвакуироваться из г. Лодзі в г. Смоленск, где и застала нас сначала Февральская, а затем и Великая Октябрьская Социалистическая революция. В послереволюционные годы отец сначала работал в Смоленском Губпродкоме, а затем – старшим контролером Смол. Губ. Контроля. 30 ноября 1919 г. отец скончался от воспаления лёгких. Мать с 1917 г. работала сначала в Губпродкоме, а потом бухгалтером Смоленского Облзу, вплоть до июня 1941 г. … .

Окончание гражданской войны позволило возобновить учебу. Уже в 1921 г. я восстановился студентом Археологического института и, сдав установленные экзамены, окончил его в 1922 г. В том же 1922 г., осенью, я поступил студентом Смоленского Университета по историческому циклу словесно-исторического отделения Педфака. В 1926 г. я окончил университет, а в мае 1928 г. защитил дипломную работу на тему “Археологические памятники Смоленской губернии”, на основе полевых работ, проводимых мною на территории Смоленщины с 1921 г. Отсутствие исторической кафедры при Смоленском Университете побудило меня принять приглашение директора Могилевского государственного исторического музея и переехать в БССР для работы в музее в должности старшего научного сотрудника. В ноябре 1932 г. я, параллельно с работой в музее, начал чтение курса истории древнего мира в Могилевском Педагогическом Институте. В ноябре же 1932 г. постановлением Государственного Ученого Совета мне было присвоено ученое звание доцента (прот № 9 от 27.XI.-1932). Начало великой Отечественной войны застало меня в г. Могилеве, и 29 июня 1941 г., как командир запаса я был мобилизован…” [4, с. 3].


**Раскопкі на гарадзішчы Барсучыная горка**

У перыяд жыцця ў г. Магілёве В. Тарасенка займаўся плённай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасцю. Напрыклад, у 1928 і 1930 гг. сумесна з А.М. Ляўданскім абследаваў гарадзішча Змяёўка (Пелагееўскае). На Крывельскім гарадзішчы на Шклоўшчыне выявіў рэшткі глінабітнай печыдомніцы, шлакі. Таксама ў 1937 г. даследаваў на значнай плошчы гарадзішча Барсукова горка (Палыкавічы-1, Магілёўскі раён), дзе ўпершыню ў беларускай археалогіі выявіў жытлы слупавой канструкцыі [3, с. 17]. У архіве ІГ НАН Беларусі, дзякуючы дапамозе В.У. Мядзведзевай, удалося знайсці фотаздымкі з раскопак гарадзішча Барсучыная горка. У час экспедыцыі ў 1930 г. у Чавускім раёне ў в. Доўгі Мох быў выяўлены і апісаны цікавы каменны надмагільны помнік у выглядзе грыба. Вось як гучала апісанне гэтага артэфакта ў 1930 г.: “Беларуская акадэмія навук, навукова-дасьледчы інстытут гісторыі, секцыя археолёгіі. Назва – Надмагільны помнік у відзе грыба (фалас?). Мясцовасць – в. Доўгі Мох, Чауск. р. Калі зафіксаваны – 1930 г. Кім зафіксавана – Тарасенка. Экспэдыцыяй 1930 г. у складзе Тарасенкі, А.К. Супінскага і А.Я. Дуісбург быў знойдзены на старадаўнім кладбішчы в. Доўгі Мох (каля шляху на г. Ст. Быхаў), гэты гранітны камень, у выглядзе грыба ў ½ узроста чалавека. На камені выцарапан від крыжа (пазнейшы). Зарас камень скарыстован у якасці надгробнага помніка. Даннай экспедыцыяй прынят за старажытны фаллос. Тарасенка” [2].


**Надмагільны помнік у выглядзе грыба**

В. Тарасенка таксама чытае лекцыі і выступае ў калектывах ад “Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў Беларусі”. У Дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласці ёсць некалькі цікавых дакументаў, якія тычацца В.Р. Тарасенкі. Цалкам прыводзім змест анкеты ад 25 кастрычніка



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1930 г., якая вельмі добра перадае атмасферу той эпохі. Анкета запоўнена ад рукі на друкаваным бланку на дарэформеннай беларускай мове – "тарашкевіцы": "Сэкцыя Навуковых Працаўнікоў Беларусі. Анкета. 1. Прозьвішча, імя і імя па бацьку. Тарасенка, Васіль Радзівонаў. 2. Узрост. 30 г. 3. Нацыянальнасць. Расеец. 4. Сацыяльнае палажэньне. Бацька – служачы з сялян (б. Курскай губэрніі). 5. Партыйнасць. Б/п. 6. Склад сям'і. Маць і яе сястра на ўтрыманьні толькі памагаю ім. 7. Лік пакояў і кв. плошча кватэры. Адзін пакой, плошчай 3х3,25 с. 8. Хатні адрас. г. Магілёў, 2-й Кастрычнікавы завулак, дом №18. 9. Спэцыяльнасць. Палеоэтнолёгія, гісторыя першабытнай культуры, археолёгія мясц. Край. 10. Займаемая пасада. Навуковы супрацоўнік. 11. Дзе працуе. Магілёўскі Дзяржаўны Музэй. 12. Кароткі жыцьцёпіс. Адукацыя – скончыў курс Унівэрсытэту і Маск.Археолёгічнага Інстытуту. Працаваў: у Чырвонай Арміі, РСІ, Губ.Архіве і фунд. Бібліотэце Смал.ДзяржУніверсітэта. Апрача гэтага бясплатна працаваў 4 гады ў ліку Сакратара і Кіраўніка Археолёгічнай часткі Смал. Т-ва Краязнаўства, а таксама прымаў аддзел ў працы раённага музею Т-ва і Бібліографічнай Камісіі. Зараз з'яўляюсь Сябрам праўленьня Маг.Т-ва Краязнаўства і Сакратарём Гіст-КультСэкцыі яго. Навуковая праца: досьледы археолёгічных помнікаў , галоўным чынам гарадзішч і неолітычных стаянак Смаленшчыны ў колькасьці больш 100, таксама і курганаў. 13. Ці вядзе навуковую працу і якую. Апрацоўка матар'ялаў апошніх гадоў і новыя досьледы на тэрыторыі б. Магілеўскай Акругі. 14. Пералік друкаваных прац (падрабязна). У часопісе "Эхо связи" за 1923 г. № 5 артыкул "Археология , её Значение и ценность как науки," в № 6-7 за той жа год "Японская катастрофа с научной точкі зрения" і в Научных Известиях Смоленского Государственного Университета т. IV, вып. 3 "Следы неолітической стоянкі бліз д. Верхніх Немыкарей Смоленского у-з" ў т. II "Прац Археолёгічнай Камісіі БАН" 2 артыкула: "Археолёгічныя досьледы гарадзішч на Смаленшчыне" і "Археолёгічныя абсьледваньні на Смаленшчыне ў 1929 г." Адослан ў рэдакцыю "Наш край" артыкул "Этнолёгічная экспэдыцыя па ўсходняй частцы Магілёўшчыны ўлетку 1930 г." Рыхтую да друку працу "Сляды культуры неоліту і эпохі гарадзішч вышнявінах Дняпра." Шмат звестак аб маёй працы ў артыкулах… ў часопісах і газэтах мясцовых і цэнтральных. 15. Зьвесткі аб культпрацы: а) Ці вядзе культпрацу, апрача навучальных устаноў, і якую. Апрача працы ў т-ве краязнаўства рабіў лэкцыі і справаздачы: ў Зоатэхнікуме і ў вайсковай часьці б) Калі не, дык якую працу можа весьці (у рабочых клюбах, лекцыі, у акруговых гарадох і інш). Магу праводзіць культпрацу па сваёй спэцыяльнасці. 16. У якіх профэсыянальных і грамадзянскіх організацыях прымае ўдзел. Апрача краязнаўчай арганізацыі быў па выбарам: "нар. засядацелем" ў Судзе, дэлегатам з'ездаў і інш. 17. Заробак, аснаўная пэнсыя, пабочныя даходы, заробак членаў сям'і . Стаўка па Музэю – 110 р. ў м-ц, пабочных даходаў не маю. 18. Стан здароўя. Больш-менш здароў, але маю нэўроз сэрца і малакроўнасць. 19. У якіх профсаюзах быў раней, да ўступленьня ў Саюз Белпрацасьветы . Адзін год, пасьля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі – 1922 г. – ў Саюзе Саўслужачых; з 1923 г. – у Саюзе Асьветы. 20. З якога часу у Саюзе БЕЛПРАЦАСЬВЕТЫ і №сябр. білету. з 20.XII. – 1929 г. № 4243 і пасьведчаньне Сэкцыі Навуковых Работнікаў БССР № 350 ад 20.II.30 г. Подпіс Тарасенка. Дата запаўненьня 25.X.1930 г." [1, с. 23].

В. Тарасенка прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Меў некалькі ўзнагарод. Адразу пасля вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў у 1944 г. працуе ў Інстытуце гісторыі АН БССР і прыступае да археалагічнага вывучэння Мінскага Замчышча. Не хапала прафесійных археолагаў. А В.Р. Тарасенка быў вельмі адукаваным чалавекам і археолагам высокай кваліфікацыі. Валодаў у рознай ступені некалькімі мовамі: польскай, рускай, беларускай, нямецкай, французскай, лацінскай і ўкраінскай. Адчуваўся вялікі недахоп у працоўнай сіле, і ў першыя гады раскопак у якасці рабочых выкарыстоўваліся нямецкія ваеннапалонныя. У час даследаванняў былі выяўлены рэшткі гарадской драўлянай забудовы, вулічныя насцілы, падмурак мураванай царквы XII ст. Сёння сталічная плошча 8 Сакавіка. Па выніках гэтых раскопак Васіль Тарасенка разам з архітэктарамі распрацавалі прапанову па музеефікацыі Мінскага Замчышча. І ў Беларусі была магчымасць стварыць археалагічны музей накшталт "Бярэсце" [2, с. 3].

На вялікі жаль, гэта прапанова не была здзейснена. У Мінску ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа АН Беларусі ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ёсць асобны фонд В.Р. Тарасенкі, які ўтрымлівае артыкулы, рэцэнзіі, характарыстыкі, фотаздымкі, малюнкі і іншыя дакументы, якія тычацца як самога гісторыка, так і ў цэлым гістарычнай навукі Беларусі. Напрыклад, ёсць аўтабіяграфія ад 8 снежня 1935 г. рэпрэсаванага ў часы сталінізму археолага Сяргея Дубінскага, альбомныя замалёўкі археалагічных знаходак у Магілёўскай губерні археолагаў Е. Раманава, М. Турбіна, У. Сізова і інш. У фондзе ёсць фотаздымкі з выявай самога даследчыка, фота з археалагічных раскопак Мінска і Полацка, зробленыя самім В.Р. Тарасенкам. Вось урывак з характарыстыкі з фонда ад 1946 г. з Інстытута гісторыі АН БССР: "… Из археологических работ В.Р. Тарасенко за последнее время необходимо отметить произведённые им, совместно с археологами Е.А. Цегак-Голубович и В.М. Голубовичем, в 1945 году раскопки "Замчища" в Минске, которые дают основания говорить о существовании в XI-XII вв. на "Замчище" древнего русского города Минска [2, с. 346]. Восенню 2019 г. удалося ўзяць невялікае інтэрв'ю ў археолага, які некалькі год поплеч працаваў з В.Р. Тарасенкам. Вось што расказаў пра свайго настаўніка вядомы беларускі гісторык, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдніх вякоў і новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Пётр Фёдаравіч Лысенка: "Васіль Радзівонавіч Тарасенка варты памяці і пашаны. Перш за ўсё можна падкрэсліць яго сціпласць і добразычлівасць. Ніколі не выхваляўся, ніколі не падкрэсліваў свае асабістыя заслугі, інтэлігентнасць у паводзінах, стрыманасць, цудоўныя чалавечыя якасці. Росту быў сярэдняга. Шчуплага целаскладу. Ахвотна падтрымліваў сувязі з калектывам. Удзельнічаў у агульных мерапрыемствах, што праводзіліся ў рамках аддзела."

В.Р. Тарасенка ўсё сваё жыццё прысвяціў гістарычнай навуцы і археалогіі. Зрабіў вялікі ўнёсак у вывучэнне гісторыі Магілёўшчыны і Беларусі ў цэлым. Гэты навуковец варты нашай памяці і шанавання. У будучым варта ў Магілёве на старым корпусе Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова ўсталяваць памятную дошку ў гонар археолага, а ў новым мікрараёне назваць адну з вуліц іменем Васіля Радзівонавіча Тарасенкі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. ДАМВ. – Ф. 927. Воп. 1. Спр. 3. С. 23.
2. Навуковая бібл. імя Я. Коласа. Ф. 40.
3. Седзін, А.А. Археалагічныя старажытнасці Магілёўшчыны / А.А. Седзін. – Магілёў, 2014.
4. ЦНА НАНБю. – Ф. 2. Воп. 1. Спр. 3906. С. 3.
5. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2 / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – 464 с. : іл.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова